Гісторыя той ці іншай навучальнай установы нярэдка бывае Гісторыяй з вялікай літары. Так здараецца, прынамсі, у некалькіх выпадках: калі сам "гісторычны" ўзрост установы выклікае пашану і спараджае шматлікія ўспаміны і сведчанні, або калі за Гісторыяй стаяць добрыя і вялікія справы, або, нарэшце, калі ў Гісторыю ўсур'ёз і надоўга ўвайшлі людзі, што тут вучыліся і вучылі... У выпадку з установай адукацыі "Магілёўская дзяржаўная гімназія-каледж мастацтваў" паядналіся ўсе гэтыя фактары: узрост, справы, людзі. І, адпаведна, здзейснілася Гісторыя. Гэтымі днямі гімназія-каледж урачыста адзначыць свой 90-гадовы юбілей. Аднак гэтая "равесніца БССР" зусім не адчувае сябе бабулькай. Сутнасць і статус установы адукацыі новага тыпу не даюць ёй сябе так адчуць. Усе памкненні і надзеі тутэйшых выкладчыкаў на чале з дырэктарам, заслужаным дзеячам культуры Рэспублікі Беларусь Людмілай Аляксееўнай Мішчанка, звязаны з выхаваннем тых, хто заўтра будзе рабіць гонар нашай краіне ды і ўжо робіць гэты гонар сёння... Тут, шануючы гісторыю і традыцыі, людзі літаральна ствараюць будучыню.

З гордасцю за выпускнікоў, з радасцю за новыя поспехі дзяцей

І ўсе ж вернемся спачатку ў далёкі 1919-ты, калі па ініцыятыве аматараў музыкі і пры актыўным удзеле беларускага кампазітара Мікалая Чуркіна ў Магілёве быў створаны духавы аркестр, на аснове якога 19 красавіка таго ж года адкрылася першая рабочая студыя. Яна неўзабаве і стала магілёўскай дзіцячай музычнай школай № 1 імя М.А.Рымскага-Корсакава. Заканамерна ўзнікае пытанне: а якое дачыненне мае магілёўская ДМШ № 1 імя Рымскага-Корсакава, гэта значыць пазашкольная ўстанова творчага профілю, да сённяшняй установы сістэмы Міністэрства адукацыі "Магілёўская дзяржаўная гімназія-каледж мастацтваў"? Самае непасрэднае: не было б першай — не было б і другой, але пра гэтае унікальнае ў гісторыі пераўтварэнне крыху пазней...

Напасадзе дырэктара Магілёўскай гімназіі-каледжа мастацтваў Л.А.Мішчанка працуе ўжо амаль трыццаць гадоў.

З першых дзеянаванняў дзіцячай музычнай школы ў ёй працавалі таленавітыя музыканты-выкладчыкі і арганізатары дырэктар, выкладчык па класе трубы Лазар Маркавіч Зісман, піяністка Рахіль Львоўна Блюман (пазней стала дырэктарам Маскоўскага музычнага вучылішча), піяніст, выпускнік Пецярбургскай кансерваторыі Аляксандр Федаравіч Боркус і інш. Першы выпуск адбыўся ў 1923 годзе. Вядома, што ў ліку выпускнікоў быў будучы прафесар Маскоўскай кансерваторыі Леў Гінзбург. Сярод іншых важных падзей з даўняй гісторыі школы варта згадаць адкрыцце на яе базе ў 1937 годзе Магілёўскага музычнага вучылішча імя М.А.Рымскага-Корсакава (да 1960 года школа і вучылішча працавалі ў адным будынку), узнагароджанне ўстановы Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР у 1938-м.

У 1980 годзе на пасаду дырэктара магілёўскай дзіцячай музычнай школы прыйшла Людміла Аляксееўна Мішчанка, і — гэтая навучальная ўстанова перажыла свой другі дзень нараджэння. Выкладчыкі калектыў узначаліў незвычайны і апантаны чалавек. Уражвае ўжо нават сама біяграфія Людмілы Аляксееўны: у маладосці, якая прайшла ў Казахстане, яна актыўна займалася спортам, была членам зборнай каманды Казахскай ССР па мастацкай гімнастыцы, адной з першых у Казахстане атрымала па гэтым відзе званне майстра спорту. Аднак разам з захапленнем спортам жыла ў яе душы з дзяцінства і іншая страсць — музыка, якая ў рэшце рэшт і перамагла. У 1974 годзе Людміла Аляксееўна, на той час ужо маючы дыпломы аб заканчэнні Казахскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута (па спецыяльнасці "матэматыка і чарчэнне") і Алма-Ацінскага музычнага вучылішча (па спецыяльнасці "фартэпіяна"), перабралася на пастаянае жыхарства ў Магілёў, і з гэтага часу яе педагагічная дзейнасць развівалася ў адным рэчышчы — музычнай адукацыі таленавітых дзяцей.

Першыя гады сваёй работы тады яшчэ ў магілёўскай ДМШ № 1 Людміла Аляксееўна прыгадвае адначасова з хваляваннем і настальгіяй: апошнія дзяньки савецкай бесклапотнасці, хаатычная змена генсекаў, гарбачоўская перабудова і галоснасць, нарэшце, па-сапраўднаму знакавы для ўстановы 1989 год — сямідзесяцігоддзе школы і тысяча рэвалюцыйных задум у галаве... "Рыхтуючыся да юбілею, мы правялі велізарную архіўна-пошукавую работу, — распавядае дырэктар. — Знайшлі шмат цікавай інфармацыі пра гісторыю школы, яе славутых выпускнікоў і выкладчыкаў... 70-гадовы юбілей мы адзначалі вельмі ярка і сталі яшчэ больш ганарыцца нашай школай. Але ж юбілеі заўсёды падштурхоўваюць да роздуму, да нейкіх падсумаванняў: што ўжо зроблена і што можна зрабіць яшчэ? І вось тады ўжо я зразумела, што ў рамках дзіцячай музычнай школы нам нельга было заставацца. Яасны рух наперад вымагаў кардынальна новых рашучых крокаў".

Чаго каштавалі Людміле Аляксееўне гэтыя рашучыя крокі, ведае, напэўна, толькі сама яна: згуртавала вакол сябе каманду аднадумцаў, распрацавала канцэпцыю бесперапыннай адукацыі адораных дзяцей у сістэме "пачатковая школа — ліцэй", падрыхтавала патрэбную для рэарганізацыі ДМШ нарматыўна-прававую дакументацыю, нарэшце, змагла пераканаць у неабходнасці адкрыцця новай навучальнай установы ўлады горада. Не менш было і цалкам тэхнічных момантаў, паколькі будынак музычнай школы не быў прыстасаваны да правядзення заняткаў па агульнаадукацыйных прадметах. Патрэбна было вырашаць пытанні з размяшчэннем класаў, набыццём школьнага рыштунку, добраўпарадкаваннем вучэбных аўдыторый і прылягаючай да школы тэрыторыі, папаўненнем фондаў вучэбнай і метадычнай літаратуры, аснашчэннем класаў камп'ютэрамі і г.д. А галоўнае — неабходна было змяніць псіхалогію педагогаў, што многа гадоў адпрацавалі ў сістэме музычнай адукацыі, падабраць кваліфікаваных настаўнікаў-прадметнікаў, асабістым прыкладам павесці за сабой педкалектыў.

У чэрвені 1991 года Магілёўскі гарвыканкам прыняў рашэнне аб стварэнні на базе дзіцячай музычнай школы № 1 ліцэя музыкі і харэаграфіі. З 2004 года гэта — Магілёўская дзяржаўная гімназія-каледж мастацтваў. На сённяшні дзень навучальных устаноў падобнага тыпу ў нашай краіне шэсць: тры ў Мінску, па адной у Бабруйску, Маладзечне і Магілёве. У Магілёве шлях да стварэння гімназіі-каледжа, здаецца, быў самым пакручастым...

Тады, у 1991 годзе, успамінае Людміла Аляксееўна, у большасці выкладчыкаў быў сапраўдны шок: 31 жніўня людзі сабраліся на традыцыйны педсавет і толькі там даведаліся, што яны працуюць ужо не ў музычнай школе, а ў гімназіі-каледжы мастацтваў. Іншая справа, што Людміла Аляксееўна не звольніла ні аднаго чалавека, кожнаму знайшлося месца ва ўстанове новага тыпу. "Нашы людзі ўсё-такі малайцы, яны настолькі хутка зарыентаваліся ў новай сітуацыі, зразумелі або адчулі, што ўся гэтая навізна — тое, што ім сапраўды патрэбна для развіцця і рэалізацыі іх творчага патэнцыялу, урэшце, для элементарнага натхнення!..." Амаль адразу ж у ліцэі сфарміраваўся трывалы касцяк аднадумцаў, потым ужо працэс пайшоў сваім натуральным ходам: выкладчыкі, якія прывыклі да практыкі навучання ў сямігодцы ды па сваіх чалавечых і прафесійных магчымасцях не змаглі прыстасавацца да новых умоў, паступова адсеяліся, перайшоўшы ў пачатковую школу; самыя ж мабільныя сталі працаваць у гімназічных класах і на старшай ступені каледжа. Хоць, падкрэслівае дырэктар, строгага размеркавання сярод выкладчыкаў у гімназіі-каледжы не існуе: занадта прывабнай для тых жа педагогаў старшага звяна бывае мяккасць, падатлівасць вучняў юнага ўзросту. Самы апошні прыклад — сённяшні шасцікласнік Міша Валчкоў, які з першага класа займаўся ў педагога каледжа Рыгора Уладзіміравіча Чыбісава і які зусім нядаўна атрымаў першую прэмію на Рэспубліканскім адкрытым конкурсе выканаўцаў на народных інструментах імя Жыновіча.

* * *

Наогул жа, сёння Магілёўская гімназія-каледж мастацтваў — гэта самадастатковы і цэласны арганізм, дзе ўсё прадумана да дробязей і разлічана на адно — гарманічнае развіццё дзіцяці і фарміраванне сродкамі мастацтва (у першую чаргу музыкі і харэаграфіі) творчай, духоўна багатай асобы, якімі б збітымі гэтыя словы часам ні здаваліся. У пачатковую школу (1—4 класы) прымаюцца на конкурснай аснове дзеці, якія маюць музычныя і харэаграфічныя здольнасці. У гімназіі, дзе ўсе класы па спецыяльных прадметах з'яўляюцца профільнымі, навучанне праводзіцца па 21 інструменце: фартэпіяна, скрыпцы, альце, віяланчэлі, флейце, габоі, кларнеце, фагоце, валторне, тубе, трамбоне, трубе, ударных інструментах, баяне, акардэоне, гітары, цымбалах, балалайцы і домры, а таксама па харэаграфіі і харавым дырыжыраванні. У каледжы ажыццяўляецца падрыхтоўка спецыялістаў па наступных спецыяльнасцях: інструментальнае выканальніцтва (фартэпіяна, аркестравыя струнныя інструменты, аркестравыя духавыя і ўдарныя інструменты, інструменты народнага аркестра), дырыжыраванне (акадэмічны хор), музыказнаўства і харэаграфічнае мастацтва (народны танец). Беражлівае стаўленне педагогаў да творчай прыроды дзіцяці, адмысловая стратэгія вядзення імі адукацыйнага працэсу, супрацоўніцтва з прафесарска-выкладчыцкім складам Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, БДПУ імя Максіма Танка і БДУ культуры і мастацтваў — усё гэта дазваляе педкалектыву гімназіі-каледжа не толькі паспяхова вырашаць задачу прафесійнага навучання на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі, але і ажыццяўляць падрыхтоўку выпускнікоў да далейшага навучання ў ВНУ. Штогод практычна ўсе выпускнікі паступаюць у профільныя вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Асаблівай гордасцю гімназіі-каледжа з'яўляюцца 102 стыпендыяты спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Лаўрэатамі ж самых розных міжнародных і рэспубліканскіх выканальніцкіх конкурсаў і фестываляў у розныя гады сталі 290 навучэнцаў, толькі за апошнія пяць гадоў — 155 індывідуальных выканаўцаў і творчых калектываў. На апошнім конкурсе імя Жыновіча, пра які ўжо згадвалася вышэй, званне лаўрэатаў атрымалі ажно 13 навучэнцаў. "Людміла Аляксееўна! Ну хіба можна так "распранаць" краіну?" — жартам тады звярталіся да дырэктара куратары конкурсу.

Нельга не сказаць і пра актыўную канцэртную дзейнасць, наладжаную ва ўстанове. Тут працуюць 17 творчых калектываў, з іх пяць — узорныя: харэаграфічны ансамбль "Вясна" і "Вяснушкі", духавы аркестр, аркестр народных інструментаў і канцэртны хор. Штогод навучэнцы гімназіі-каледжа прымаюць удзел у 80—100 канцэртах і фестывалях гарадскога, абласнога і рэспубліканскага ўзроўню, паспяхова выступаюць з гастролямі за межамі нашай краіны. Роўна год назад, у красавіку 2008-га, салісты і творчыя калектывы ўстановы па прапанове Міністэрства культуры арганізавалі вялікі канцэрт "Вясенняя фантазіі" ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі ў Мінску, што стала шыкоўным святам і для слухачоў, і для саміх навучэнцаў.

Шматлікія заслугі гімназіі-каледжа ў развіцці музычнай адукацыі і выхавання не заставаліся незаўважанымі і на самым высокім дзяржаўным узроўні. Установа неаднойчы ўзнагароджвалася граматамі і падзякамі мясцовых і рэспубліканскіх органаў улады, сярод якіх ёсць і прывітальны адрас ад імя Прэзідэнта, Ганаровая грамата Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

А найбліжэйшай яркай падзеяй у жыцці гімназіі-каледжа, натуральна, абяцае стаць юбілейна-справаздачны канцэрт. Пра тое, з якой адказнасцю падыходзіць да гэтага мерапрыемства кіраўніцтва ўстановы, можа сведчыць невялікая дэталь: на праслухоўванне ў Магілёў былі спецыяльна запрошаны лепшы рэжысёр з Мінска Ніна Осіпава (якая ставіць усе самыя значныя імпрэзы ў сталіцы з удзелам высокіх гасцей) і лепшы рэжысёр з Магілёўскай вобласці Наталля Майсеева. Праслухоўвалі і адбіралі нумары для канцэрта ажно пяць гадзін! Вердыкты былі аднолькавымі: "Фантан творчасці".

* * *

Асобна варта сказаць пра найбольш вядомых выпускнікоў гімназіі-каледжа апошніх дзесяцігоддзяў, якія сёння займаюць ключавыя пазіцыі ў вядучых аркестрах нашай (і не толькі нашай) краіны і паспяхова здзяйсняюць сольныя кар'еры салістаў. Людміла Аляксееўна называе гэтыя імёны з асаблівай гордасцю, пра некаторых гаворыць так, быццам тыя і цяпер вучацца ў гімназіі. Вось яны, гэтыя імёны: канцэртмайстар Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь, лаўрэат міжнародных конкурсаў Дзіко Маймуна; саліст аркестра Марынскага тэатра ў Санкт-Пецярбургу, стыпендыят фонду імя Уладзіміра Співакова і Міжнароднай дабрачыннай праграмы "Новыя імёны планеты" Павел Кундзянок; спявак, уладальнік Гран-пры Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску" і Гран-пры Міжнароднага конкурсу эстраднай музыкі ў Зялёнай Гуры (Польшча) Пётр Ялфімаў; артысты Прэзідэнцкага аркестра Андрэй Маўрын, Алена Пархоменка, Хрысціна Дурэйка; артыстка аркестра Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь Алена Палякова; артыст хору тэатра оперы і балета Андрэй Сідзько; канцэртны выканаўца Юлія Лонская; артыст асобнага паказальнага аркестра Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь Ільля Басін; артысты студэнцкага аркестра "Маладая Беларусь" Алена Тоўсцік, Таццяна Вайлапава, Дар'я Малачкова, Іна Кускова, Настасся Касцюшка... Можна толькі ўявіць, як горача ў гімназіі-каледжы мастацтваў будуць хварэць, напрыклад, за таго ж Пецю Ялфімава на конкурсе "Еўрабачанне" (менавіта так па-ранейшаму называюць Пятра тутэйшыя педагогі) або як шчыра будуць жадаць шчасця ў асабістым жыцці Дзіко Маймуне, якая 25 красавіка выходзіць замуж і таму не зможа прыехаць у Магілеў на юбілейныя мерапрыемствы.

Але жыццё не спыняецца, і ўжо сёння многія з цяперашніх навучэнцаў гімназіі-каледжа радуюць сваіх выкладчыкаў ці не больш, чым радавалі іх яшчэ пяць-дзесяць гадоў назад вядомыя папярэднікі-выпускнікі. Людміла Аляксееўна Мішчанка заўважае, што ўзровень пачынаючых музыкантаў павышаецца з кожным годам, і гэта не дзяжурныя словы. Напрыклад, тую праграму, з якой Дзіко Маймуна іграла на выпуску і з якой яна паступала ў кансерваторыю, сёння з поспехам выконваюць дзве дзевяцікласніцы. Або вельмі складаны твор "Карнавал у Венецыі", з якім некалі ледзьве "вырулій-выплыў" на выпуску артыст аркестра МУС Ільля Басін, сёння бліскуча грае зноў жа дзевяцікласнік. Поспехі сённяшніх навучэнцаў, іх майстэрства і жаданне пакараць усе новыя і новыя вышыні для выкладчыкаў магілёўскай установы з'яўляюцца тым эліксірам, які дапамагае ім заставацца маладымі, з радаснай усмешкай на вуснах пераадольваць усе цяжкасці і нягоды. "Вы думаеце, усе так проста? — рытарычна ўсклікае Людміла Аляксееўна. — Каб жа так... Часам здаецца, што ўсё не так, усе ляціць у нейкую прорву і твае жыцце не ўдалося. І дзеці, нават тыя, што перамагаюць на конкурсах, не жадаюць сур'ёзна займацца тэарэтычнымі дысцыплінамі (а без іх жа нікуды не паступіш), і нечакана — нейкія дзіўныя ананімныя званкі з незразумелымі папрокамі... Тады авалодвае сапраўдны адчай: а для каго мы ўсё робім, дзеля каго ўвогуле жывём?! Але вось ты заходзіш у актавую залу на чарговы канцэрт — і ўсё! Ты зноў малады, здаровы, у цябе зноў шмат энергіі, і ты ідзеш наперад, забыўшыся на ўсе цяжкасці...

"А не надакучыла вам дырэктарстваваць? Як-ніяк ужо амаль трыццаць гадоў, і напэўна ж, бясконца вось так, ад радасці праз цяжкасці да новай радасці..." — пытаюся я ў сваю чаргу ў кіраўніка гэтай навучальнай установы і чую ў адказ: "Дык у гэтым жа і ўвесь сэнс, што сыходзяць адны пакаленні, прыходзяць новыя... І кожнае наступнае дорыць новую радасць. Часам на выпускных прарываецца: Божа мой! Гэта ж такія дзеці сыходзяць! Агаляецца хор, агаляецца аркестр... Але надыходзіць першага верасня, малыя садзяцца на месца выпускнікоў — і зноў усё пайшло-паехала, і мы, выкладчыкі, нічога не губляем, а, наадварот, набываем. Іншая справа, што з кожным новым пакаленнем становіцца ўсё цяжэй навучыць маладых адрозніваць добрае ад дрэннага, сапраўднае ад фальшывага, шчырае ад падманнага... І тады якраз на памяць прыходзяць вобразы нашых слаўных выпускнікоў, якія, акрамя таго, што сталі прафесіяналамі і набылі творчую свабоду, яшчэ і выхаваліся людзьмі — добрымі, моцнымі, тымі, на каго можна абаперціся. Гэта і ёсць наша галоўная мэта — вырасціць у першую чаргу чалавека..." У гэты момант у вачах Людмілы Аляксееўны Мішчанка нечакана выступаюць ледзь бачныя слёзы. Слёзы радасці і трывогі.

Мікола ЧЭМЕР.

Мінск — Магілёў — Мінск.

Фота аўтара.

Нават ніводны перапынак тут не абыходзіцца без музычнага інструмента.

Кіраўніку ўстановы заўсёды ёсць што абмеркаваць з навучэнцамі.

Да пачатку заняткаў застаецца пяць хвілін. Значыць, яшчэ ёсць час парэпеціраваць!

Прагноз надвор'я

Сёння днём па рэспубліцы чакаецца пераменная воблачнасць. Пераважна без ападкаў. Вецер пераменны 3—8 м/с. Тэмпература паветра +11 — +16°С, па паўднёвым захадзе да +18°С.

У наступныя двое сутак па рэспубліцы чакаецца такое надвор'е.

24.04 пераменная воблачнасць. Пераважна без ападкаў. Вецер паўночна-ўсходні 3—8 м/с. Тэмпература паветра ноччу -3 — +4°С, днём +9 — +16°С.

25.04 невялікая воблачнасць. Без ападкаў. Вецер няўстойлівы, слабы. Тэмпература паветра ноччу -3 — +3°С, днём +12 — +18°С.

Рэспубліканскі гідраметэацэнтр.

Калектыў супрацоўнікаў Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў выказвае глыбокае спачуванне дырэктару Брэсцкага рэгіянальнага цэнтра тэсціравання **Уладзіміру Валянцінавічу Марозу** з прычыны напаткаўшага яго гора — смерці МАЦІ.

Педагагічны калектыў гімназіі № 13 Мінска, навучэнцы і іх бацькі выказваюць шчырае спачуванне дырэктару **Вользе Робертаўне Чарнавусавай** у сувязі з цяжкай стратай — смерцю МАЦІ.

Намеснік галоўнага рэдактара Вераніка Саламевіч

ISSN 1994-9146

ЗАСНАВАЛЬНІК — МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
Рэгістрацыйны нумар 370
Ліцэнзія № 02240/0068373 Мін-ва юстыцыі Беларусі на ажыццяўленне дзейнасці па распаўсюджванні прававой інфармацыі на тэрмін з 02.11.2007 па 02.11.2012

НАШ АДРАС:
220013, МІНСК, ПРАСПЕКТ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ, 77
Тэлефоны: прыемная рэдакцыі — 287-17-83 (факс); намесніку галоўнага рэдактара — 287-16-70; бухгалтэрыі — 287-16-70; аддзелаў: рэклямы 292-94-66, кіравання адукацыяй, сацыяльных праблем — 292-44-02; праблем выхавання, культуры — 287-15-88; навукі і ВНУ — 287-17-89, школ — 287-19-80; уласнага карэспандэнта ў Брэсце — 47-94-53.
belredng@ng-press.info; www.ng-press.info
Хостінг: Цэнтр электроннага бізнесу TUT.BY

Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць свае прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім выдадзены пашпарт), асноўнае месца работы, зваротны адрас, нясуць адказнасць за дакладнасць фактаў і іншай інфармацыі.

Пісьмы, рукапісы, фотаздымкі і малюнкі не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.

Аб'явы могуць друкавацца не толькі на дзяржаўных, але і на замежных мовах.

Матэрыялы, пазначаныя знакам ®, носяць рэкламны характар.

Меркаванне аўтараў публікацый не абавязкова адлюстроўвае пункт гледжання рэдакцыі.

Адказны дзяжурны
Ігар ГРЭЧКА.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку», 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79.
Аб'ём — чатыры друкаваныя аркушы. Спосаб друку — афсетны. Фармат А2. Індэкс 63867.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12. Заказ № 2177
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Падпісана да друку 22.4.2009 г. у 16.00
Тыраж 34 500 экземпляраў.
© "Настаўніцкая газета", 2009

РЕЗЕРВНАЯ КОПІЯ